# ЭПІДЭМІЯ ЧУМЫ НА ПРЫКЛАДЗЕ ГОРАДА СЛОНІМА Ў 1630 Г.

**В. І. Захарыч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*valyazakharych@gmail.com;*
*навук. кір. – У.А. Падалінскі, канд. гіст. навук, дац.*

Артыкул прысвечаны даследаванню праблемы эпідэміі ў межах Рэчы Паспалітай, у тым ліку на прыкладзе аднаго горада на падставе тагачасных дакументаў. У навуковы зварот уводзяцца новыя звесткі аб розных баках жыцця насельніцтва ВКЛ і Рэчы Паспалітай ва ўмовах пашырэння інфекцыйных хвароб. Аўтар прыводзіць звесткі аб галоўным кампаненце эпідэміялагічнага перыяду – барацьбе з распаўсюджаннем хваробы і мерах, накіраваных на хутчэйшае аздараўленне асяроддзя. Праз асобны выпадак аналізуюцца наступствы хваробы для г. Слоніма ў 1630 г., сярод якіх дэмаграфічныя і эканамічныя страты. Робіцца вывад аб перыядычнасці эпідэмій, выпрацаванасці схем пазбаўлення ад хваробаў, прыстасавання насельніцтва да жыцця ў неспрыяльныя гады.

***Ключавыя словы***: эпідэмія; Рэч Паспалітая; Слонім; мяшчане; ахова здароўя; нормы паодзінаў.

Эпідэміі не былі нечым незвычайным для жыхароў Рэчы Паспалітай перыяду Сярэднявечча і ранняга Новага часу. Па падліках Валянціна Грыцкевіча, эпідэміялагічныя гады адзначаліся і ў XI–XV стст. (не менш 29 разоў), і ў XVI–XVIII стст. (не менш 80 разоў) [2, с. 35].

У дакументах, апісваючых гэтую з’яву, сустракаюца такія паняцці, як “мор”, “маравое паветра”. Аднак вызначыць, якая менавіта хвароба прыводзіла да эпідэміі ў розныя гады, складана. Часцей гэта была чума, але цалкам верагодна, што ў некаторых выпадках эпідэмію мог выклікаць і грып.

У асноўным, метады барацьбы з хваробамі былі накіраваныя на наступнае:

· Спыненне развіцця хваробы. Улады імкнуліся атрымліваць інфармацыю аб заражаных мясцінах, каб ведаць, жыхароў з якіх населеных пунктаў не варта пускаць у «здаровыя» гарады. Дзеля гэтага прадстаўнікі ўлады збіралі звесткі аб месцах распаўсюджвання хваробы [4, p. 298].

· Ізаляцыя хворых і абмежаванне кантактаў. Так, у 1624 г. у Варшаве пад час чумы ўлады адвялі некалькі адасобленых дамоў пад каранцін [7].

· Прафілактыка. Доктар медыцыны Пётр Умястоўскі ў сваёй працы “Навука аб маравым паветры” рэкамендаваў абмежаванне руху людзей, а таксама ўвядзенне каранціну для толькі прыбыўшых у горад людзей з

заражаных мясцінаў [9]. У Варшаве працавалі асобы, якія былі адказныя за выгнанне з горада беднаты, якая лічылася разносчыкам хваробы [7]. Падобнае стаўленне было і да яўрэяў. Ёсць цікавы прыклад, калі ў 1604 г. яны сыйшлі з «хворага» Слоніма на ўскрайнія вёскі, на шляху скупаючы скот, у выніку чаго заразілі многіх вяскоўцаў [3, s. 26].

· Нагляд за хворымі і лячэнне, які часткова выконвалі ордэнскія шпіталі, хоць на той момант гэта не было іх функцыяй.

· Дэзінфекцыя. Лічылася, што хваробу можна выгнаць выкурваннем, моцным парам, праветрываннем, апрацоўкай шчолаччу ці агнём. Выкурванне адбывалася на аснове зёлак, апрацоўцы падлягалі як памяшканні ў доме, так і асабістыя рэчы [2, с. 42]. Існавалі інструкцыі, напрыклад за 1630 г., што пасцельныя рэчы хворых неабходна выветрываць ці апрацоўваць шчолаччу. Сустракаліся і радыкальныя сродкі барацьбы. Напрыклад, у пачатку XVII ст. у Вільні дамы хворых спальваліся з іх рэчамі [2, с. 41].

· Ачышчэнне. Пахаванне памерлых звычайна павінна было праходзіць на працягу некалькіх гадзінаў пасля смерці, каб не распаўсюдзілася зараза і на памінкі не сабраўся люд. Трупы закопвалі за горадам у полі, каб не раскапалі злодзеі ці родзічы для пахавання цела на царкоўных могілках. Таму запатрабаваныя былі магільшчыкі [7].

Эпідэміі безумоўна мелі ўплыў на эканоміку (сельскагаспадарчыя і рамесныя работы праводзіліся не ў поўным памеры, і скарб атрымліваў менш падаткаў), палітыку (перарывалася работа магістратаў, соймікаў і соймаў, судоў, пераносіліся прыезды паслоў іншых дзяржаў), сацыяльную сферу (людзі не маглі рабіць свае паўсядзённыя справы ў поўным памеры) [2, с. 39; 4, p. 298].

Цікавым з’яўляецца сацыяльны аспект вывучэння праблемы, які можа адлюстраваць узаемаадносіны між людзьмі і іх спосабам выжывання ў неспрыяльных умовах. Акрамя станоўчых крокаў, скіраваных на падаўленне эпідэміі і хуткае вяртанне да нармальнага жыцця, сустракаліся прыклады дэвіянтных паводзінаў. Часцей за ўсё, гэта былі асобныя людзі ці групы асобаў, якія займаліся грабежніцтвам.

Улады вялі рэестры стратаў, і адным з такіх прыкладаў з’яўляюцца дакументы па гораду Слоніму за 1630 г. з аддзелу рукапісаў бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта. Дакумент складаецца з трох частак: «Рэестр спісання апусцеўшых дамоў…», «Рэестр памерлых…», і «Скаргі і розныя павесткі». Сабраныя дадзеныя былі накіраваныя слонімскаму старосце Яну Станіславу Сапегу, сыну Льва Сапегі. Ян Станіслаў як раз у 1630 г. вярнуўся з замежжа ў свае ўладанні [6, s. 377], і па ўсёй бачнасці, спісы складаліся ў тым ліку для таго, каб даць уяўленне старосце пра стан горада. Прыкладна з 1627 па 1632 гг. лакальныя

эпідэміялагічныя ачагі ўзнікалі на розных абшарах Кароны і Княства. І эпідэмія ў Слоніме ўпісваецца ў гэты кантэкст. Хутчэй за ўсё, гэта была хваля эпідэміі, якая прыйшла з Нямеччыны і Аўстрыі [8, s. 84]. Нягледзячы на эпідэмію 1630 г., у 1631 г. у Слоніме адбыўся Галоўны соймік ВКЛ. Таму мяркуем, што да гэтага часу ў горадзе хвароба ўжо суцішылася.

Дакумент паказвае, якія аспекты эпідэміі былі найбольш важнымі для дзяржаўнай адміністрацыі. І, безумоўна, рашаючым быў матэрыяльны аспект.

Рэестры дапаўняюць адзін аднаго. Калі першы спіс апісваў апусцелыя дамы, то другі ўжо рабіў акцэнт на загінуўшых жыхарах і іх родзічах – магчымых спадкаемцах маёмасці. Звярталася ўвага на тое, каму застаўся дом пасля смерці ўладальніка. Калі ўзнікала пытанне, ці мае права чалавек валодаць домам, то пытанне пакідалася на разгляд старосты. Напрыклад, у час эпідэміі памерла ўся сям'я Дзіковічаў, і маці жонкі забрала сабе хату. У гэтым выпадку складальнікі рэестра адзначылі, што ёй патрэбна прадставіць старосце свае правы на валоданне маёмасцю [5, арк. 5]. Пытанне ўзнікала і да Яна Крывопіса, краўца, які пасля смерці бацькоў і цёткі забіраў сабе маёмасць родных [5, арк. 1 адв., 3].

Важнай часткай рэестраў быў вопіс маёмасці. На яго падставе можна прасачыць сацыяльна-маёмаснае расслаенне гараджан, а таксама зразумець, што хвароба закранала не толькі бедны пласт насельніцтва. Перапісчыкаў цікавілі такія рэчы, як памер зямлі, колькасць быдла, аб'ём збожжа, апісанне адзення і сукна, пералік рознага кшталту посуду і прыладаў працы, а таксама грашовы капітал гаспадара. Цалкам верагодна, што ў дакументах так падрабязна апісвалася маёмасць, бо суседзі рабавалі гаспадаркі памерлых сем'яў. Аб чым, дарэчы, сведчаць запісы ў рэестрах. Напрыклад, жыхар горада Галас у памерлага Несцера Бубешкі скраў 14 гарнцаў (каля 42 л) збожжа, з'еў 4 авечкі, местачковец Шаер забраў бочку аўса, а Кісяленя ўвогуле засеяў яго зямлю жытам [5, арк. 5 адв.–6].

Дамашнюю жывёлу памерлых гаспадароў вывозілі ў вёску Грыбава, што ў пяці кіламетрах ад горада. Аднак да пункта прызначэння яна даходзіла не ўся. Зафіксаваны выпадак, калі на вуліцы Замкавай пасля смерці гаспадара Ігната Клімовіча засталіся два валы. Адзін з якіх трапіў да астатняй скаціны за горад, а лёс другога аказаўся больш трагічным: яго з'елі замкавыя ахоўнікі [5, арк. 2].

Яшчэ адзін прыклад паказвае, што на чужым горы можна было зарабіць. Пасля смерці Паўла Муляра дзяўчына Марушка, па ўсёй бачнасці, ягоная работніца, узяла ключы ў хату і ноччу скрала пярсцёнкі і посуд. Яе муж падрабіў тастамент, забраў частку рэчаў з сундукоў

нябожчыка, завалодаў ягонымі грашыма, на якія пад час эпідэміі жыў у карчме [5, арк. 3 адв., 7]. Акрамя раскрадання маёмасці, дамы памерлых таксама руйнаваліся і ішлі на дровы [5, арк. 5–11].

На жаль, немагчыма сказаць дакладна, наколькі моцна горад пацярпеў ад эпідэміі ў дэмаграфічным плане. Скласці статыстыку даволі складана, паколькі не захаваліся дакументы, якія б сведчылі пра колькасць людзей да эпідэміі.

Па падліках атрымліваецца, што загінула як мінімум 88 дарослых асоб і мінімум 6 дзяцей. Сустракаліся выпадкі, калі хвароба забірала жыцці цэлай сям'і. Тады ў рэестры пісалася, што памерлі муж з жонкай і іх дзеці, а колькасць памерлых не ўказвалася. Былі запісы аб тым, што «чалавек памёр з усім». Гэта пакідае пытанне, што ўкладвалася ў значэнне слова «ўсё» (магчыма, мелася на ўвазе ягоная сям'я). Таксама як мінімум 10 чалавек памерла, не пакінуўшы пасля сябе нашчадкаў. Каля 50 дамоў засталіся пустымі без спадкаемцаў.

Відавочна, што выратаванне мясцовыя жыхары бачылі ў рэлігіі. Так, у 1630 ці ў 1631 г. у Слоніме, у спадзяванні на пазбаўленне ад хваробы, правялі ўрачыстую працэсію з абразом Святога Бенно і машчамі Святога Казіміра [8, s. 85]. Гэта была распаўсюджаная практыка. Вядома, што людзі часта маліліся пад час эпідэмій заступніку Польскага Каралеўства і Вялікага Княства Літоўскага Св. Казіміру, бо ён славіўся цудатворнымі вылекаваннямі [4, p. 296]. Таксама ў 1630 г. у Слонім была запрошана місія бернардзінцаў [1, с. 103; 2, s. 31], а ў хуткім часе – адкрыўся іх шпіталь. Ёсць інфармацыя аб адкрыцці ў 1630 г. аптэкі ў горадзе.

З дакумента нельга дакладна даведацца, якім чынам улады дапамагалі мяшчанам пераадолець наступствы эпідэміі. Аднак можна выявіць некалькі момантаў. Так, ставілася пытанне аб наданні дзецям-сіротам, якія страцілі бацькоў ад хваробы, апекуноў. Таксама мясцовая адміністрацыя дапамагала праводзіць расследванне злачынстваў.

Такім чынам, эпідэміялагічныя гады не былі рэдкасцю для тагачаснага насельніцтва Рэчы Паспалітай. За многія гады былі выпрацаваны метады барацьбы з хваробай, улічваліся рэкамендацыі лекараў і вопыт уласных назіранняў за хворымі. Эпідэмія 1630 г. у Слоніме выразна ўпісваецца ў агульнагістарычны кантэкст. Дакументы, якія датычаць гэтай падзеі, дазваляюць вызначыць наступствы хваробы для горада і прааналізаваць сацыяльныя механізмы выжывання людзей у надзвычайных абставінах.

**Библиографические ссылки:**

1. *Габрусь, Т.В.* Мураваныя харалы: Сакральная архітэктура беларускага барока. Мінск, 2001.

2. *Грицкевич, В.П.* С факелом Гиппократа: Из истории белорусской медицины. Минск, 1987..
3. *Aleksandrowicz, B.* Z przeszłości Słonima i ziemi słonimskiej. Słonim, 1935.
4. *Baronas, D.* Ligos ir epidemijos // Lietuvos Didžiosios Kunigaikštijos kultūra: tyrinėjimaiirvaizdai. Vilnius, 2001. – P. 293–302.
5. Epidemijos nuostolių sąrašai // Vilniaus universiteto biblioteka. – F59-3.
6. *Gryko-Andrejuk, B.* Choroba psychiczna? Relacje Jana Stanisława Sapiehy z rodziną i otoczeniem // Honestas et turpitudo. Magnateria Rzeczypospolitej w XVI – XVIII wieku. Białystok, 2019. S. 371 – 382.
7. https://www.jhi.pl/artykuly/najwieksze-od-zydow-powietrza-zarazy-bywaja-epidemie-a-stosunek-warszawskiego-mieszczanstwa-do-zydow-w-xviixviii-wieku,604.
8. *Liedke, M.* Materiały do historii morowego powietrza w Słonimiu w latach 1630 i 1631 // Przeszłość Demograficzna Polski. Wrocław, 2012. T. 31. S. 83–94.
9. *Umiastowski, P.* Nauka O Morowym Powietrzu Na Czwory Xięgi Rozlozona. Kraków, 1591.